# «ЯК МИ ЛЮБИЛИ — ТА Й РОЗІЙШЛИСЯ»...

**РАМАНС «Місяць на небі» на ўкраінскай мове вельмі люблю слухаць у выкананні сваёй матулі. Яна не забыла родную мову, хоць і жыве на тэрыторыі Беларусі куды больш за паўстагоддзя. Можа таму так хвалюе ўсё, што адбываецца зусім недалёка — на «її рідній Україні».**

## Дзякуй, я пастаю?

Па інтэрнэце цяпер гуляе відэаролік простага ўкраінца, які ўпершыню апынуўся ў Маскве і каментуе ўсё, што бачыць вакол. Цэнзурных слоў у яго не хапае, кажа накшталт: «Тут очень-очень круто... вы, конечно, гоните... ну такую фигню базарят про Россию, про Москву... непривычно, но мозги перестраиваются... я хочу, чтобы мы дружили...» Карацей, 24-гадовага хлопца, які нарадзіўся ўжо ў незалежнай Украіне, уражваюць у тым ліку прыязныя адносіны да яго самога. І ён гэтаму шчыра здзіўляецца.

Не ведаю, з якой мэтай той украінец прыехаў у белакаменную. Мо ад службы ў войску збег, а хутчэй за ўсё, на заробкі падаўся, як і многія. А вось мая сяброўка ў Гомель з Украіны прыязджала проста адпачыць ад сваёй рэальнасці. Замест Адэсы з яе самым чорным морам яна выбрала беларускі абласны цэнтр, дзе прайшла наша агульная студэнцкая маладосць. Тады, вы разумееце граніцы былі празрыстыя. У беларусаў, украінцаў і расіян было адно грамадзянства — СССР. Месца, дзе набываць вышэйшую адукацыю, часцей за ўсё выбіралі самае бліжэйшае ці зручнае па транспартным перамяшчэнні.

З сяброўкай прыехала яе 20-гадовая дачка — сённяшняя студэнтка-завочніца аднаго з рэгіянальных ВНУ Украіны. Яна за межы сваёй дзяржавы трапіла ўпершыню. І таму рэакцыі былі падобныя на эмоцыі юнака, згаданага ў пачатку тэксту. Дарэчы, пачыналася іх паездка на Беларусь сурова. Не абышлося без прыгод. Прынамсі, як і ў мяне год таму, калі адважылася праехацца ў госці ў адзін з украінскіх райцэнтраў.

У Кіеве мае знаёмыя перасаджваліся на аўтобус міжнароднага напрамку. Білеты бралі загадзя, праз інтэрнэт. Зразумела ж, месцы замаўлялі сядзячыя. Скажаце — як яны могуць быць іншымі ў міжнародным рэйсе? Аказалася, могуць. Дзевяці чалавекам, сярод якіх былі і беларусы, украінскі кіроўца прапанаваў, калі ўвогуле хочуць ехаць, СТАЯЦЬ у салоне падчас руху. Потым, калі ўжо ад'ехалі, быццам злітаваўся і выдаў пластыкавыя зэдлікі — сядзелі на іх у праходзе. Ахвярамі аўтаагрэсіі сталі менавіта тыя, хто набываў білеты праз інтэрнэт. Сярод іх — мае знаёмыя.

Значна спазняецца міжнародны аўтобус пачаў яшчэ на жоўта-блакітнай тэрыторыі. Таму затрымалі яго зусім не доўгія праверкі на межах, як можна было б меркаваць. Па раскладзе транспарт павінен быў прыбыць у 23.30, а прыйшоў пасля чатырох раніцы. Можаце ўявіць жаданне маіх сябровак як мага хутчэй пабачыць беларускую зямлю. Увесь гэты час у сваёй машыне на аўтавакзале я наіўна чакала, што вось-вось прыедуць. Ведаеце, як яны потым здзівіліся, калі ў гомельскай маршрутцы ім без напаміну выдалі талончыкі за праезд.

## Ментальныя пытанні

Нагадаю яшчэ адзін выпадак, які здарыўся гады два таму. Тады мая сяброўка прыязджала ў родны ўніверсітэт, каб аднавіць страчаны дыплом аб адукацыі. Выйшла з дакументам зусім разгубленая. Здзівілася таму, што ўсё атрымалася за 10 хвілін (замову яна зрабіла загадзя па электроннай пошце) і ніхто нават не намякнуў на неабходнасць прэзента. Гаворыць, на радзіме без гэтага немагчыма ніводнай паперкі падпісаць. Гэтым разам было шмат пытанняў, якія часам ставілі мяне ў тупік. Напрыклад, калі буднім днём мы ехалі па горадзе, дзяўчына спытала, чаму так мала людзей на вуліцах. Мне здавалася — як звычайна, таму паціснула плячыма:

— Відаць, большасць на рабоце, — адказала.

— А ў нас у гэты час у разы больш людзей валаецца.

«Валацца» — слова дыялектнае. Але з кантэксту зразумела, што сёння многім у вялікім абласным цэнтры Украіны асабліва няма чым заняцца. Вось і «валаюцца». Між тым, сяброўка сама цяпер сярод беспрацоўных. Муж — ваенны пенсіянер мае нейкі гарантаваны бонус ад дзяржавы. У вольны час ён займаецца рамесніцтвам. Лічыць, што яму нявыгадна рэгістравацца афіцыйна, бо работа сезонная, а падаткі прыйдзецца плаціць пастаянна.

Сяброўка — калега. Працавала ў розных сродках масавай інфармацыі, але ж апошні прыватны наймальнік нядаўна паведаміў, што яму сайт больш не патрэбны, і звольніў усіх супрацоўнікаў. Большасць з іх атрымлівалі заробак у канверце і таму нічога не маглі патрабаваць з уладальніка, які застаўся ўсім вінен вялікія сумы. Пацярпелі і тыя, хто быў, як мая сяброўка, афармлены афіцыйна. Ім проста сказалі: «Грошай няма і не будзе». Адвакаты не дапамаглі, а ўлады і не збіраліся.

Можа таму рэйдарскія захопы там сталі звычайнай справай, і маёй знаёмай таксама аднойчы сумна «шанцавала» ляжаць тварам у падлогу. Цяпер без жартаў разважае пра магчымасць работы ў Расіі сядзелкай. Гавораць, можна няблага зарабіць такім чынам.

Дарэчы, абедзве дачкі ў гэтай сям'і працуюць у сферы грамадскага харчавання — не па спецыяльнасці. Старэйшая марыць пра ад'езд у прывабныя цёплыя краіны, накшталт Арабскіх Эміратаў, дзе быццам вар'яцкія заробкі і гарачыя хлопцы. А што, можа пашанцуе і нейкі шэйх возьме чацвёртай жонкай? Затое не прыйдзецца змагацца за хлеб надзённы.

Пасля паездкі да нас малодшая задумалася пра эміграцыю ў Беларусь, дзе, гаворыць: «хлопцы такія ж сімпатычныя, як і краіна». Спадзяецца знайсці тут работу па асноўнай спецыяльнасці «мадэльер-дызайнер адзення». Лічыце гэта запытам вельмі прыгожай і адукаванай украінкі, якая сапраўды хоча працаваць.

## Мэтанакіраваны недакурак

У Гомелі мы неяк вярталіся позна вечарам па дварах сярод шматпавярховак. Мае госці дзівіліся наяўнасці ліхтароў, якія свецяць і таму, што хадзіць можна не толькі па цэнтральных вуліцах.

— А з якога часу да якога ў вас ваду адключаюць?

Гэта было чарговае пытанне, якое мяне збянтэжыла. Нават не зразумела, што размова ідзе не пра двухтыднёвую прафілактыку летам згодна з графікам, а пра іх штодзённае адключэнне гарачай вады з 21.00 да 6.00. Проста юнае стварэнне пераносіла свае рэаліі на наша жыццё.

Потым мы паехалі ў Ветку. Для тых, хто не ведае, — невялічкі райцэнтр зусім побач з Гомелем, галоўны скарб якога — унікальны музей стараверскай культуры. «Охі-ахі» былі бясконцыя. Аднак, акрамя экспанатаў і цікавай экскурсіі, маіх спадарожніц яшчэ больш уражвалі рэчы, да якіх мы даўно прызвычаіліся. Выкашаныя ўзбочыны, добраўпарадкаваныя дзіцячыя пляцоўкі, кантэйнеры для паасобнага збору смецця і сацыяльная рэклама, якая заклікае: «Будзь моцным — данясі смецце да урны».

— Глядзі, якія палеткі прыбраныя!

— Салома як прыгожа спакаваная!

— А гэта што, прыпынак аўтобуса і вакол няма смецця?

— У вас у райцэнтры дарогі лепшыя, чым у нашай сталіцы!

— Ой, я бачыла, жанчына кінула недакурак і ён не даляцеў да урны. Дык, уяўляеш, яна падышла, падняла яго і паклала ў смецніцу!

## Застацца нельга з'ехаць

Адзін мой знаёмы паскардзіўся ўкраінкам, што за чысціню прыходзіцца дорага плаціць: штотыдзень пару гадзін супрацоўнікі ўбіраюць тэрыторыю, якая замацавана за кожным прадпрыемствам. Мае не зразумелі, і малодшая літаральна наехала на яго:

— І што, гэта ж не цяжка! Я б сама выходзіла, калі патрэбна, каб чысціню навесці. Да таго ж, калі сам прыбіраеш, то не будзеш раскідваць смецце і іншым не дазволіш!

Былі моманты, калі наўмысна паказвала сваім госцям недзе кінутыя абгорткі і вышчарблены асфальт. Запэўнівала, што ў нашай краіне яшчэ ёсць што ўдасканальваць. Мы прайшлі пешшу амаль усю цэнтральную вуліцу Гомеля і потым доўга гулялі па парку і набярэжнай Сожа. Тут ужо старэйшая заўважыла, што яна цяпер дакладна разумее, якім чынам трацяцца бюджэтныя сродкі, і што ўсё зробленае — недарма.

Мая сяброўка — праваслаўная. Царква, у якую яна ходзіць шмат гадоў, адносіцца да Маскоўскага патрыярхату. Яе сваякі ўпэўнены, што апошні факт робіць яе жыццё ва Украіне не вельмі бяспечным. У Гомелі, калі мы трапілі на службу, яна заплакала, калі пачула падчас літургіі, як святар чытаў малітву пра мір на Украіне. Дарэчы, так моляцца на ўсёй праваслаўнай прасторы з 2014 года.

Калі я стаяла і махала рукой услед аўтобусу, падумала, што сёння многія нармальныя грамадзяне суседняй дзяржавы гатовыя пакінуць яе — хоць тушкай, хоць чучалам. Бязвіз ім у дапамогу. Спрашчэнне правілаў прыняцця расійскага грамадзянства таксама.

Пры тым, што цяпер шмат украінцаў працуюць і ў Расіі, і ў краінах Еўрасаюза на некваліфікаваных работах, вельмі многія хочуць да іх далучыцца. Пажадана пры гэтым яшчэ і грошы сэканоміць.

## Дарогу адолее мацнейшы

Пакуль што эфект ад бязвізу ў поўнай меры адчуў толькі паліграфічны камбінат «Украіна», які друкуе біяметрычныя пашпарты. Ён не змог своечасова выканаць заказ: было замоўлена амаль 1,5 млн пашпартоў, а надрукавалі толькі каля 1 млн, як сцвярджае старшыня падкамітэта па пытаннях развіцця турызму, курортаў і рэкрэацыйнай дзейнасці Вярхоўнай Рады Украіны Ганна Раманава.

Тры гады таму яна гасцінна прымала беларускіх журналістаў у старажытным Чарнігаве ў якасці намесніка галавы Чарнігаўскай гарадской Рады. Зараз дэпутат Вярхоўнай Рады Украіны дае несуцяшальны для краіны прагноз: «Калі ўкраінцы, якія жадалі нелегальна працаўладкавацца пад відам «турыстаў», атрымаюць доўгачаканыя біяметрычныя пашпарты (а гэта аказалася нялёгка) — нас чакае чарговая хваля працоўнай міграцыі... І, першым чынам, гэта будзе адток найбольш працаздольнага насельніцтва, дэфіцытных працоўных кадраў і таленавітай моладзі. Па свежых звестках даследавання Цэнтра Разумкова, кожны чацвёрты ўкраінец хацеў бы эміграваць у краіны ЕС.

Гэтыя працэсы яшчэ больш пагаршаюць дэмаграфічны крызіс ва Украіне і прыводзяць да негатыўнай дыспрапорцыі насельніцтва. Асноўныя працоўныя мігранты — маладыя людзі 25—35 гадоў. У краіне застаюцца пенсіянеры і беспрацоўныя, якія самі маюць патрэбу ў выплатах з бюджэту. Усё гэта прыводзіць да дэфіцыту Пенсійнага фонду і зніжэння інвестыцыйнай прывабнасці Украіны».

Сярод грамадзян Украіны вельмі многа тых, каму абрыдла даваць хабар, жыць на смецніку, не плаціць падаткі і ашукваць адзін аднаго. Яны змогуць адаптавацца, ім абрадуюцца — хоць на Захадзе, хоць на Усходзе. Іншая справа — усе эмігранты свядома ідуць на паніжэнне сацыяльнага статусу і пэўныя грамадзянскія абмежаванні ў правах.

* * *

***Памятаеце словы Булгакава — рускага класіка, які нарадзіўся ў Кіеве, укладзеныя ў вусны прафесара Праабражэнскага з «Сабачага сэрца»: «Калі я, уваходзячы ў прыбіральню, пачну, выбачайце за выраз, мачыцца міма ўнітаза, у прыбіральні пачнецца разруха. Такім чынам, разруха не ў клазетах, а ў галовах». Тут важна высновачыцца: ці мы едзем у Еўропу, ці ствараем Еўропу там, дзе жывём.***

***Беларусы, здаецца, у працэсе. Кідаць абгорткі ў сметнік ужо навучыліся. Крыху зразумелі, навошта трэба плаціць падаткі, і тое, што заробак лепш легальны. Ну а астатняе — паступова засвоім? Можа, і ўсміхацца навучымся? Каб быць цэнтрам Еўропы.***

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
iost@zviazda.by

